Нахождение общества в состоянии «открытого» сегодня необходимо для существования демократического правового государства, которое является его непосредственным регулятором и без которого «открытое общество» рискует перейти на стадию «полностью абстрактного или безличного общества». Такое общество можно будет описать одной гиперболой: «общество, в котором люди практически никогда не встречаются лицом к лицу» [1, с. 219].

Регулятором правовое демократическое государство является по причине того, что именно оно берет на себя обязанность по созданию и предоставлению своим гражданам условий и возможностей для практического осуществления ими своих прав и свобод, т.е. дает «открытому обществу» старт для его саморазвития и с которым впоследствии взаимодействует как точно такой же субъект. Согласно этому мы можем говорить о том, что правовое государство, исполняя свои обязанности, создает законодательную и институциональную основу, тем самым обеспечивая права граждан.

В связи с изложенным ранее необходимо осознавать важность принципа взаимных прав и обязанностей, согласно которому настоящая свобода возможна только при условии исполнения обязанностей и активного отношения к предоставленным правам. Поскольку именно этот принцип права удерживает общество в его идеальном состоянии, состоянии «открытого», а существование государства, в котором права, свободы и законные интересы граждан являются наивысшей ценностью — возможным.

Таким образом, теория «открытого общества» К. Поппера сохраняет свою актуальность и сегодня, предлагая современному обществу свободное и прогрессивное будущее, основанное на саморазвитии и уважении к прошлому, а также тесную связь общества и государства, основанную на взаимосвязи прав и обязанностей.

**Источник**

1. *Поппер, К. Р.* Открытое общество и его враги : в 2 т. / К. Р. Поппер. — М. : Феникс : Культур. иницатива, 1992. — Т. 2. — 528 с.

***Д. М. Русенка***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В. М. Лянцэвіч*
*БДЭУ (Мінск)*

# ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ ЯК ФАКТАР РЭЛІГІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ДЗЯРЖАВАХ-КНЯСТВАХ

Гісторыя хрысціянства на беларускіх землях у перыяд Старажытнарускай дзяржаўнасці пачынаецца не з хрышчэння, а з выбару веры. Прычыны выбару хрысціянства бачацца ў наступным: па-першае, у сям'і князя Уладзіміра ўжо

меўся досвед хрышчэння: бабка Уладзіміра, княгіня Вольга, прыняла новую веру ў 940-я гг., а за ёй рушыла і яе світа, аднак гэта была яе персанальная справа [1, с. 58]; па-другое, князя цікавіў стратэгічны саюз з Візантыяй. Іншымі словамі, выбар веры быў моцна звязаны з выбарам важнага напрамку знешняй палітыкі. Іслам прынялі позняя Хазарыя і Волжская Булгарыя — супернікі, і, галоўнае, дзяржавы, пабудаваныя на зусім чужой этнічнай аснове.

Працэс хрысціянізацыі закрануў беларускія землі, якія знаходзіліся ў цесным кантакце з Кіевам, з канца X ст. Найбуйнейшымі палітычнымі ўтварэннямі на тэрыторыі Беларусі былі княствы з цэнтрамі ў Полацку і Тураве. Хрысціянізацыя ўсходняй часткі беларускіх зямель пачалася фактычна адразу — з канца X–XI ст. На тэрыторыі, дзе жылі плямёны дрыгавічоў, гэтыя дзеянні сустрэлі супраціў.

Распаўсюджанне монатэізму на беларускіх землях было паступовым, але геаграфічна нераўнамерным. У Падзвінні, Падняпроўі і Пасожжы прыняцце хрысціянскага дагматызму адбывалася хутчэй, чым у Панямонні.

Полацкая епіскапская кафедра была ўтворана ў 992 г. і з’явілася першай на тэрыторыі Беларусі. Гэта падзея адносіцца да часу кіравання князя Ізяслава, сына роўнаапостальнага Уладзіміра і полацкай князёўны Рагнеды. Летапісная згадка пра першы праваслаўны полацкі храм-царкву Прасвятой Багародзіцы датуецца 1007 г. У сярэдзіне XI ст. пад час княжання Ўсяслава Чарадзея ў Полацку быў узведзены чацвёрты ў хрысціянскім свеце Сафійскі сабор.

Тураўская епархія была заснавана ў 1005 г. і з’яўляецца другой па старажытнасці сярод праваслаўных епархій у Беларусі. Таксама, як і полацкія, тураўскія епіскапы пастаўляліся на кафедру кіеўскімі мітрапалітамі. Аднак у XII ст. сустракаюцца згадкі аб тым, што тураўскае веча мела права выбіраць епіскапа [2, с. 35].

Адным з найважнейшых фактаў выбару ўсходнімі славянамі праваслаўя з’яўляецца ўплыў Візантыйскай імперыі, блізкасць культур і моў, палітычныя саюзы і канфлікты. Сярод складанага комплексу заахвочвальных прычын выбару візантыйскага варыянту хрысціянства Руссю на адным з першых месцаў варта адзначыць культурна-гістарычную значнасць дзяржаўнага суседства з Візантыяй і Балгарыяй. Кіеўская Русь была ўцягнута самой Візантыяй у знешнепалітычную дзейнасць у якасці бліжэйшага суседа і ваеннага партнёра. У той жа час імперскія памкненні Візантыі стваралі для Русі пэўную небяспеку, якая, як правіла, выяўлялася ў дамаганні на ўсталяванне ў хрысціянізаваных краінах палітычнага панавання, прадыктаванага бягучымі інтарэсамі імперыі.

Такім чынам, у самой распрацаванай форме руска-візантыйскія кантакты сталі з’яўляцца адлюстраваннем пасля афіцыйнага прыняцця хрысціянства як дзяржаўнай рэлігіі Кіеўскай Русі [3].

### Крыніцы

1. *Пічэта, У. І.* Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. — Мінск : БДУ, 2005. — 179 с.

2. *Голубеў, В. Ф.* Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / В. Ф. Голубеў, І. Ф. Кітурка. — СПб. : Неўскі прастор, 2014. — 170 с.

3. *Медельцов, А. Ф.* Начало Православной Руси. Принятие христианства и древнерусская литература [Электронный ресурс] / А. Ф. Медельцов // Борисовское благочиние Борисовская епархия Белорусская Православная Церковь. — Режим доступа: https://www.blagobor.by/article/history/drevn-lit. — Дата доступа: 01.03.2024.

***А. В. Савінцава***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. М. Лянцэвіч*
*БДЭУ (Мінск)*

# КАДЫФІКАЦЫЯ ПРАЦОЎНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА БССР У МІЖВАЕННЫ ЧАС

Пачатак XX ст. у Расіі стаў часам вострага абмеркавання праблемы «працоўнага пытання». Рэфармаванне працоўнага заканадаўства было неабходна ў сувязі з аб'яднаннем рабочага класа і яго барацьбы з буржуазіяй. Кодэкс законаў аб працы РСФСР 1918 г. (далей — КЗаП) быў першым працоўным кодэксам не толькі на тэрыторыі РСФСР, але і ва ўсім свеце. Гэты кодэкс прызнаваўся дзейным іншымі савецкімі рэспублікамі. Так, у Маніфесце Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага ўрада Беларусі, выдадзеным 1 студзеня 1919 г., абвяшчалася: «Усталёўваецца васьмігадзінны працоўны дзень … і адначасова ўваходзяць у сілу ўсе дэкрэты РСФСР па забеспячэнні рабочага стану» [1, с. 117]. Увогуле, ў КЗаП 1918 г. атрымалі заканадаўчае замацаванне найважнейшыя заваёвы рабочага класа: 42-гадзінны штотыднёвы бесперапынны адпачынак; вызваленне жанчын ад работ на працягу 8 тыдняў да- і пасля родаў з захаваннем заробку і забарона працы дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў. Аднак кодэкс утрымліваў і нормы аб усеагульнай працоўнай павіннасці ўсіх працаздольных грамадзян ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў, згодна з якой беспрацоўным належала ўстаць на ўлік у аддзелах размеркавання рабочай сілы [2].

Неабходнасць у новым кадыфікаваным акце працоўнага заканадаўства ўзнікла напачатку 1920-х гадоў. Пераход ад ваеннага камунізму да НЭПу супаў з утварэннем у снежні 1922 г. СССР і прыняццем 9 лістапада 1922 г. на IV сесіі УЦВК новага КЗаП. Дзеянне Кодэкса па арт. V пастановы УЦВК аб увядзенні яго ў дзеянне было афіцыйна распаўсюджана на тэрыторыю Беларусі. КЗаП 1922 г., у адрозненне ад КЗаП 1918 г., увёў добраахвотны парадак найму, да працоўнай павіннасці работнікі прыцягваліся толькі ў выключных выпадках, з'явілася магчымасць заключаць калектыўныя працоўныя дамовы [3, с. 1100]. Упершыню КЗаП 1922 г. замацоўваў становішча, у адпаведнасці з якім час пачатку і заканчэння працоўнага дня, а таксама перапынкаў у працы ўсталёўваліся на лакальным узроўні.

Наступны этап у кадыфікацыі працоўнага заканадаўства ў БССР быў звязаны з прыняццем Кодэкса аб працы Беларускай ССР (далей — КаП), які быў зацвер-